З **17 жніўня** ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзіць выстава **«Праз пакуты – да шчасця»**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння драматурга, празаіка, публіцыста Алеся Махнача (1922 – 2001). Алесь (Аляксандр Іванавіч) Махнач належаў да таго пакалення пісьменнікаў, творчы і жыццёвы шлях якога склаўся пад уздзеяннем нялёгкіх, але гераічных падзей Вялікай Айчыннай вайны. У чэрвені 1941 г. удзельнічаў у абароне Брэсцкай крэпасці, быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. Пасля вызвалення з канцэнтрацыйнага лагера ў 1945 г. знаходзіўся на лячэнні ў ваенных шпіталях, застаўся інвалідам. Літаратурную дзейнасць А. Махнач пачынаў вершамі, аднаактовымі п'есамі. Пісаў пераважна для дзяцей, шмат увагі надаваў асэнсаванню падзей Вялікай Айчыннай вайны. У творчым калейдаскопе пісьменніка – п'есы, сцэнкі, камедыі, скетчы, інтэрмедыі, драматычныя, празаічныя і вершаваныя творы, краязнаўчыя і публіцыстычныя нарысы. Некаторыя яго творы перакладаліся, ставіліся ў тэатрах, на беларускім радыё і тэлебачанні. Экспазіцыя знаёміць з жанравай разнастайнасцю твораў пісьменніка. Многія з іх увайшлі ў зборнікі, некаторыя друкаваліся асобна або ў перыядычных выданнях. Да



ўвагі наведвальнікаў – *«Драматычныя мініяцюры»*, *«Да пары збан ваду носіць...»*, *«Усе ідуць у нагу»*, *«Мы будзем жыць»*, *«Дзеці крэпасці»*, *«Няхай красуе жыццё»*, *«Камандзір Усходняга форта»*, краязнаўчыя нарысы *«Нізок»*, *«Забалацце»* з серыі «Ведаць свой край Беларусь» і інш. Асобны раздзел выставы – матэрыялы пра жыццёвы і творчы шлях А. Махнача.

Выстава працуе па 29 верасня.